**ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**11 лютага 2013 г. N 49-ПСР5**

# АБ ГАНАРОВАЙ ГРАМАЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

(в ред. постановлений Президиума Совета Республики от 27.01.2014 N 260-ПСР5,
от 10.08.2015 N 689-ПСР5, от 20.11.2020 N 121-ПСР7, от 06.06.2022 N 348-ПСР7,
от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб Ганаровай грамаце Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

Апісанне Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 27.01.2014 N 260-ПСР5)

Апісанне знака Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

--------------------------------

(сноска <*> исключена. - Постановление Президиума Совета Республики от 27.01.2014 N 260-ПСР5)

2. Прызнаць страціўшымі сілу:

Постановление Президиума Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь от 4 февраля 2009 года N 64-ПСР4 "Об утверждении Положения о Почетной грамоте Национального собрания Республики Беларусь";

Постановление Президиума Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь от 10 марта 2009 года N 92-ПСР4 "О внесении изменений в Постановление Президиума Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь от 4 февраля 2009 года N 64-ПСР4";

Пастанову Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 1 красавіка 2010 года N 336-ПСР4 "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Палажэнне аб Ганаровай грамаце Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь".

3. Накіраваць гэту Пастанову ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Савета Рэспублікі

Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А.Рубінаў

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Савета
Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
30.01.2013 N 55-СП5

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Прэзідыума
Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
11.02.2013 N 49-ПСР5

## ПАЛАЖЭННЕ
## АБ ГАНАРОВАЙ ГРАМАЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

(в ред. постановлений Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5,
от 20.11.2020 N 121-ПСР7, от 06.06.2022 N 348-ПСР7, от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

1. Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей - Ганаровая грамата) узнагароджваюцца грамадзяне і арганізацыі Рэспублікі Беларусь, грамадзяне замежных дзяржаў,

адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь за заслугі ў развіцці заканадаўства, парламентарызму, мясцовага самакіравання, ва ўмацаванні дэмакратыі, міждзяржаўных і міжпарламенцкіх сувязей, за дзейнасць па забеспячэнні правоў і свабод грамадзян, вялікі ўклад у фарміраванне і рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян Рэспублікі Беларусь можа ініцыіравацца пры ўмове, што яны ўжо былі ўзнагароджаны ці адзначаны граматамі і (або) падзякамі дзяржаўных органаў ці іх кіраўнікоў, а таксама маюць працоўны стаж не менш за дзесяць гадоў. Гэта не распаўсюджваецца на асоб, узнагароджаных дзяржаўнымі ўзнагародамі, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, работнікаў сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

2. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай ажыццяўляецца старшынямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, пастаяннымі камісіямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прэзідыумамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі.

Грамадзяне і арганізацыі Рэспублікі Беларусь, грамадзяне замежных дзяржаў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем названых у пункце 3 гэтага Палажэння, прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай па пісьмовым узгадненні з адпаведнымі прэзідыумамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі. Гэта не распаўсюджваецца на выпадкі ініцыіравання ўзнагароджання Ганаровай граматай старшынямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прэзідыумамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

Грамадзяне замежных дзяржаў, акрамя тых, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай па пісьмовым узгадненні з Міністэрствам замежных спраў.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай ажыццяўляецца з улікам звестак аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, атрыманых з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у парадку, прадугледжаным заканадаўствам, а таксама звестак аб учыненых грамадзянамі Рэспублікі Беларусь дзеяннях, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь.
(часть четвертая п. 2 введена постановлением Президиума Совета Республики от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

Грамадзяне і арганізацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне замежных дзяржаў могуць звяртацца з хадайніцтвам аб узнагароджанні Ганаровай граматай да службовых асоб і органаў, указаных у частцы першай гэтага пункта. Хадайніцтвы павінны змяшчаць інфармацыю згодна з дадаткам 1, або дадаткам 2, або дадаткам 3 да гэтага Палажэння. Пры гэтым хадайніцтвы грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзян замежных дзяржаў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем хадайніцтваў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў адносінах да работнікаў гэтых органаў, павінны быць пісьмова ўзгоднены з органамі, пералічанымі ў частцы другой гэтага пункта.
(в ред. постановлений Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5, от 06.06.2022 N 348-ПСР7)

3. Не падлягаюць узгадненню ініцыіруемыя прадстаўленні ў адносінах да:

дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, работнікаў сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, членаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і работнікаў яго Апарату, суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і работнікаў яго Сакратарыята, суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і работнікаў яго апарату, работнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, цэнтральных апаратаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Генеральнай пракуратуры, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь і работнікаў яе апарату, работнікаў

Нацыянальнага банка, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных;
(в ред. постановлений Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7, от 06.06.2022 N 348-ПСР7)

работнікаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, у адносінах да якіх маюцца пісьмовыя ўзгадненні або хадайніцтвы гэтых органаў;

грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь, грамадзян замежных дзяржаў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь, хадайніцтвы ў адносінах да якіх пісьмова ўзгоднены з органамі, пералічанымі ў частцы другой пункта 2 гэтага Палажэння.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

4. Службовыя асобы ці органы, указаныя ў частцы першай пункта 2 гэтага Палажэння, разглядаюць унесеныя хадайніцтвы аб узнагароджанні Ганаровай граматай і прымаюць рашэнне аб ініцыіраванні прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай ці аб адхіленні хадайніцтва. Аб прынятым рашэнні інфармуюцца грамадзяне і арганізацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне замежных дзяржаў, якія іх унеслі.

5. Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай, ініцыіраваныя старшынямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, уносяцца на разгляд адпаведна Савета Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай, ініцыіраваныя пастаяннымі камісіямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, уносяцца на разгляд адпаведна Савета Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з пастаяннымі камісіямі Савета Рэспублікі або Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якіх уваходзяць пытанні, што датычацца сферы дзейнасці прадстаўляемых да ўзнагароджання Ганаровай граматай. Гэта не распаўсюджваецца на выпадкі ініцыіравання прадстаўленняў да ўзнагароджання Ганаровай граматай дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, работнікаў сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

Прэзідыумы абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты ўносяць прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай у Палату прадстаўнікоў або ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай, ініцыіраваныя прэзідыумамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, падлягаюць абавязковаму папярэдняму разгляду і ўзгадненню пастаяннымі камісіямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якіх уваходзяць пытанні, што датычацца сферы дзейнасці прадстаўляемых да ўзнагароджання Ганаровай граматай.
(часть четвертая п. 5 введена постановлением Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

6. Для разгляду пытання аб узнагароджанні Ганаровай граматай прадстаўляюцца наступныя дакументы:

суправаджальнае пісьмо, у якім павінна ўтрымлівацца хадайніцтва да Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні Ганаровай граматай, якое накіроўваецца ў дзве палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Палата, якая ўказана ў пісьме першай, арганізуе разгляд прадстаўленых дакументаў. Такое пісьмо не патрабуецца ў выпадках ініцыіравання прадстаўленняў да ўзнагароджання Ганаровай граматай старшынямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, а таксама пастаяннымі камісіямі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у адносінах да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, работнікаў сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;
(в ред. постановлений Президиума Совета Республики от 06.06.2022 N 348-ПСР7, от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

рашэнне органа, указанага ў частцы першай пункта 2 гэтага Палажэння, аб прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай;

прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь згодна з дадаткам 1, або дадаткам 2, або дадаткам 3 да гэтага Палажэння;
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

пісьмовае ўзгадненне ў выпадку, прадугледжаным гэтым Палажэннем;

даведка-аб'ектыўка (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама для грамадзяніна замежнай дзяржавы, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь);

характарыстыка (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама для грамадзяніна замежнай дзяржавы, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), падпісаная кіраўніком арганізацыі;

звесткі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях аб здзейсненых грамадзянінам Рэспублікі Беларусь правапарушэннях ці аб іх адсутнасці, а таксама звесткі аб учыненых грамадзянінам Рэспублікі Беларусь дзеяннях, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, ці аб іх адсутнасці (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь);
(абзац введен постановлением Президиума Совета Республики от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

даведка аб асноўных паказчыках дзейнасці, якія з'явіліся падставай для прадстаўлення да ўзнагароджання (для арганізацыі Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь);
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі Рэспублікі Беларусь або іншага дакумента з указаннем яе поўнага і дакладнага найменя;
(абзац введен постановлением Президиума Совета Республики от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

копія пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (старонка 31) або ідэнтыфікацыйнай карткі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь).
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 12.12.2022 N 445-ПСР7)

Характарыстыка (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама для грамадзяніна замежнай дзяржавы, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь) і даведка аб асноўных паказчыках дзейнасці (для арганізацыі Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь) павінны змяшчаць усебаковую і аб'ектыўную ацэнку заслуг адпаведнага суб'екта, што з'явіліся падставай для прадстаўлення яго да ўзнагароджання Ганаровай граматай. У іх прыводзіцца падрабязнае апісанне гэтых заслуг, а таксама раскрываецца ўклад грамадзяніна або арганізацыі Рэспублікі Беларусь, грамадзяніна замежнай дзяржавы, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай або тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь у дасягненне атрыманых вынікаў.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

7. Пытанне аб узнагароджанні Ганаровай граматай разглядаецца на чарговым пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне па дадзеным пытанні афармляецца Рашэннем Савета Палаты прадстаўнікоў, Пастановай Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і з копіямі дакументаў, указаных у частцы першай пункта 6 гэтага Палажэння, накіроўваецца адпаведна ў Савет Рэспублікі, Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на працягу пяці дзён з дня яго прыняцця.

8. Узнагароджанне Ганаровай граматай праводзіцца па рашэнні Савета Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Аб адхіленні Саветам Палаты прадстаўнікоў або Прэзідыумам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай інфармуюцца орган або службовая асоба, якія яго ўнеслі.

9. Ганаровая грамата ўручаецца Старшынёй Палаты прадстаўнікоў, Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанай імі асобай, як правіла, не пазней як праз

месяц з дня прыняцця Саветам Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыумам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь рашэнняў аб узнагароджанні Ганаровай граматай.

10. Ганаровая грамата грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, грамадзяніну замежнай дзяржавы ўручаецца асабіста ва ўрачыстай абстаноўцы, арганізацыі Рэспублікі Беларусь - на ўрачыстым сходзе калектыву, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і тэрытарыяльнай адзінцы Рэспублікі Беларусь - ва ўрачыстай абстаноўцы.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

Ганаровая грамата грамадзяніну замежнай дзяржавы, які не пражывае пастаянна на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа накіроўвацца для ўручэння ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову Рэспублікі Беларусь, размешчаныя на тэрыторыі дзяржавы, грамадзянінам якой ён з'яўляецца або на тэрыторыі якой ён пастаянна пражывае.

Узнагароджанне Ганаровай граматай суправаджаецца грашовай узнагародай у памеры да дзесяці базавых велічынь або ўручэннем каштоўнага падарунка на гэту суму, за выключэннем узнагароджання арганізацый Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь, якім уручаецца толькі Ганаровая грамата. Грашовая ўзнагарода выплачваецца, а каштоўны падарунак набываецца за кошт сродкаў арганізацый, у якіх працуюць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, грамадзянін замежнай дзяржавы, прадстаўленыя да ўзнагароджання Ганаровай граматай.
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

11. Паўторнае ўзнагароджанне Ганаровай граматай не дапускаецца.

12. Грамадзянам Рэспублікі Беларусь, грамадзянам замежных дзяржаў, узнагароджаным Ганаровай граматай, уручаецца знак Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь устаноўленага ўзору.

Знак Ганаровай граматы носіцца на правым баку грудзей пасля дзяржаўных узнагарод, а пры іх адсутнасці - на іх месцы.

13. Гэта Палажэнне ўступае ў сілу з дня яго зацвярджэння Саветам Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыумам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Змяненні ў гэта Палажэнне ўступаюць у сілу пасля прыняцця адпаведных рашэнняў Саветам Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыумам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, калі не прадугледжана іншае.
(часть вторая п. 13 в ред. постановления Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

Дадатак 1
да Палажэння аб Ганаровай
грамаце Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
(в ред. постановления Президиума Совета Республики от 20.11.2020 N 121-ПСР7)

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**
**да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку ___________________________________
2. Пасада, месца працы, службы, працоўны стаж ______________________________
______________________________________________________________________________
3. Чысло, месяц і год нараджэння ____________________________________________
4. Грамадзянства ____________________________________________________________
5. Адукацыя _________________________________________________________________
6. Ці ўзнагароджваўся, адзначаўся раней граматамі, падзякамі дзяржаўных органаў ці іх кіраўнікоў і даты ўзнагароджання, адзнакі ____________________

7. Месца жыхарства і тэлефон ______________________________________________
8. Заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ____________________________________
___________________________________________________________________________
___________________________________________________________________________
Кандыдатура ________________________________________________ рэкамендавана
___________________________________________________________________________
(назва арганізацыі, дата абмеркавання, N пратакола)
для прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў,
Старшыня Савета Рэспублікі,
старшыня пастаяннай камісіі
Палаты прадстаўнікоў,
старшыня пастаяннай камісіі
Савета Рэспублікі Нацыянальнага
сходу Рэспублікі Беларусь,
старшыня мясцовага Савета дэпутатаў,
старшыня выканкама ________ _______________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)
"__" ________________ 20__ г.
М.П.

Дадатак 2
да Палажэння аб Ганаровай
грамаце Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**
**да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

1. Назва арганізацыі _______________________________________________________
2. Ці ўзнагароджвалася раней Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і дата ўзнагароджання __________________________________
3. Месца знаходжання арганізацыі і тэлефон _________________________________
4. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку кіраўніка _______________________
5. Заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь______________________________________
___________________________________________________________________________
___________________________________________________________________________
Арганізацыя ________________________________________________ рэкамендавана
___________________________________________________________________________
___________________________________________________________________________
(назва арганізацыі, дата абмеркавання, N пратакола)
для прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў,
Старшыня Савета Рэспублікі,
старшыня пастаяннай камісіі
Палаты прадстаўнікоў,
старшыня пастаяннай камісіі
Савета Рэспублікі Нацыянальнага
сходу Рэспублікі Беларусь,
старшыня мясцовага Савета

дэпутатаў, старшыня выканкама ____________ _______________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

"__" __________ 20__ г.
М.П.

Дадатак 3
да Палажэння аб Ганаровай
грамаце Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
(введено постановлением Президиума Совета Республики от 10.08.2015 N 689-ПСР5)

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**
**да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

1. Назва адміністрацыйна-тэрытарыяльнай, тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь____________________________________________________________________
2. Ці ўзнагароджвалася раней Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і дата ўзнагароджання ____________________________________
3. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку кіраўніка мясцовага Савета дэпутатаў__________________________________________________________________
4. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку кіраўніка мясцовага выканаўчага і распарадчага органа________________________________________________________
5. Заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь____________________________________
___________________________________________________________________________
___________________________________________________________________________

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная, тэрытарыяльная адзінка Рэспублікі Беларусь
_____________________________________________________________ рэкамендавана
___________________________________________________________________________
___________________________________________________________________________
(назва арганізацыі, дата абмеркавання, N пратакола)
для прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў,
Старшыня Савета Рэспублікі,
старшыня пастаяннай камісіі
Палаты прадстаўнікоў,
старшыня пастаяннай камісіі
Савета Рэспублікі Нацыянальнага
сходу Рэспублікі Беларусь,
старшыня мясцовага Савета
дэпутатаў, старшыня выканкама _________________ _____________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

"__" __________ 20__ г.
М.П.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Савета
Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
30.01.2013 N 55-СП5

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Прэзідыума
Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
11.02.2013 N 49-ПСР5

**АПІСАННЕ**
**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей - Ганаровая грамата) уяўляе сабой глянцавы ліст белага колеру памерам 297 x 420 мм.

На адлегласці 34 мм ад верхняга краю ў сярэдзіне ліста Ганаровай граматы размешчаны відарыс Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь памерам 40 x 40 мм у каляровым выкананні. Ён знаходзіцца на верхняй частцы гільяшырнай сеткі прамавугольнай формы.

Ліст Ганаровай граматы мае абрамленне ў выглядзе трох рамак. Знешняя рамка з выявай беларускага арнаменту шырынёй 5 мм светла-бэжавага колеру нанесена па перыметры ліста на адлегласці 17 мм ад верхняга і ніжняга краёў і 19 мм ад правага і левага бакоў і мае квадратныя вылучэнні на вуглах памерам 7 x 7 мм. Унутраная рамка ў выглядзе паласы светла-бэжавага колеру шырынёй 2 мм знаходзіцца на адлегласці 29 мм ад верхняга і ніжняга краёў і 32 мм ад правага і левага бакоў і аздоблена па ўнутраным краі гільяшырнай паласой шырынёй 10 мм такога ж колеру. Паміж знешняй і ўнутранай рамкамі на адлегласці 1 мм ад краёў унутранай рамкі размешчана рамка ў выглядзе стужкі колераў Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, якая складаецца з дзвюх палос - чырвонай і зялёнай у суадносінах 3:1. Яна скошана па баках і мае па два завіткі на кожным баку.

На адлегласці 5 мм ад ніжняй часткі відарыса Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь у адзін радок змешчаны словы "Ганаровая грамата", надрукаваныя літарамі залатога колеру вышынёй 12 мм. На 8 мм ніжэй у адзін радок змешчаны словы "Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь", надрукаваныя літарамі залатога колеру вышынёй 6 мм.

На 10,5 мм ніжэй друкарскім спосабам наносіцца слова "узнагароджваецца" літарамі чорнага колеру вышынёй 2,5 мм. На 11 мм ніжэй абазначаны шэсць радкоў для тэксту аб узнагароджанні, які наносіцца друкарскім спосабам.

Адлегласць паміж першымі двума радкамі і другімі двума - 8 мм, адлегласць паміж наступнымі - 14 мм.

На адлегласці 14 мм ніжэй за апошні радок, абазначаны для тэксту аб узнагароджанні, размешчаны тэкст у два слупкі, адлегласць паміж якімі - 107 мм. З левага боку ў чатыры радкі змешчаны словы "Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" літарамі вышынёй 2,2 мм. З правага боку ў чатыры радкі змешчаны словы "Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" літарамі вышынёй 2,2 мм. Адлегласць паміж радкамі - 3 мм.

У ніжняй частцы ліста Ганаровай граматы размешчаны подпісы, ініцыялы і прозвішчы асоб, якія падпісалі Ганаровую грамату. Ніжэй прастаўляюцца даты і нумары рашэнняў аб узнагароджанні.

Ганаровая грамата змяшчаецца ў алюмініевую рамку са шклом з прамымі вугламі і мацуецца ў ёй металічнымі клямарамі.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Савета
Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
30.01.2013 N 55-СП5

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Прэзідыума
Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
11.02.2013 N 49-ПСР5

**АПІСАННЕ**
**ЗНАКА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Знак Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выкананы ў выглядзе медаля. Аснову знака складае круг дыяметрам 25 мм. На вонкавым баку (аверсе) на фоне прамянёў, што разыходзяцца, размешчана стылізаваная выява Дома Урада, у цэнтральнай частцы якой знаходзіцца

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. У ніжняй частцы знака ёсць надпіс на беларускай мове "Ганаровая грамата". У правым ніжнім вуглу размешчана лаўровая галіна.

На адваротным баку (рэверсе) у ніжняй частцы размешчаны герб Рэспублікі Беларусь, пад гербам - надпіс на беларускай мове ў чатыры радкі "Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь". Круг абрамлены дзвюма лаўровымі галінамі, перацягнутымі стужкай.

Усе надпісы на знаку выпуклыя. Па акружнасці аверса і рэверса знака ёсць выпуклы борцік. У верхняй частцы знака ёсць суцэльнаштампаванае вушка для мацавання да калодкі. Знак вырабляецца з жоўтага металу з пазалотай.

Калодка мае прамавугольную форму памерам 25 x 15 мм. У ніжняй частцы калодкі ёсць суцэльнаштампаванае вушка са злучальным кольцам. З дапамогай злучальнага кольца знак мацуецца да калодкі. Калодка абцягнута муаравай стужкай чырвонага колеру шырынёй 15 мм, з левага боку якой праходзіць зялёная паласа шырынёй 5 мм. На адваротным баку калодкі ёсць мацаванне, выкананае ў выглядзе цангі з заціскам.

---